З нагоды

# «У САЛІГОРСКА ВЫДАТНЫЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ»

## Тут адкрылі новую сучасную школу

**Павіншаваць дзяцей з пачаткам вучобы і адкрыць новую сучасную школу ў Салігорску прыехаў старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН. Карэспандэнт «Звязды» даведаўся, чым парадуе свае вучняў унікальная школа.**

«Калі адкрываюцца ўстановы адукацыі, значыць, горад развіваецца. Мяркуючы па колькасці дзяцей, якія ідуць у першы клас, можна сказаць, што ў Салігорска выдатныя перспектывы. Гэтая школа па-свойму ўнікальная, таму што ўпершыню ўзведзена з канструкцый Салігорскага домабудаўнічага камбіната. Таму я думаю, што ўжо ў найбліжэйшы час у Мінскай вобласці будуць узводзіцца такія школы», — адзначыў старшыня аблвыканкама.

Праект школы сапраўды індывідуальны. Гэта каркасная канструкцыя з энергаэфектыўных сценавых трохслаёвых вонкавых панэляў, якія дазваляюць паскорыць мантаж. Такая тэхналогія таксама дазваляе эфектыўна выкарыстоўваць плошчу.

Ён адзначыў багатае насычэнне школы абсталяваннем, у тым ліку спартыўным і для правядзення ўрокаў працоўнага навучання, што важна для прафарыентацыі падрастаючага пакалення. Сёння вельмі важная прафесійная арыентацыя: «Педагог на месцы бачыць, у чым будучы выпускнік моцны. Можна ж узяць мэтавае накіраванне на прадпрыемстве і паступіць у каледж ці ўніверсітэт. Трэба працаваць і з патэнцыяльнымі работадаўцамі».

У сістэму адукацыі Мінскай вобласці ўкладваюцца немалыя сродкі. І гэта не толькі будаўніцтва, але і рамонт дзеючых аб'ектаў. Школа, збудаваная ў Салігорску, абышлася для бюджэту ў 48 мільёнаў рублёў. «Сотні мільёнаў укладваем у рамонт, у набыццё транспартных сродкаў, у будаўніцтва жылля. Напярэдадні свята адкрылі новы арэндны дом для педагогаў. І будзем далей працягваць рухацца ў гэтым кірунку, — падкрэсліў Аляксандр Турчын. — Прыемна прымаць такія рашэнні і бачыць вынік».

Школу № 15 у Салігорску пачалі ўзводзіць у сакавіку мінулага года. Праектная магутнасць установы адукацыі — 930 вучняў, якія будуць займацца ў 42 класах. Тут размясціліся два камп'ютарныя класы, два лінгафонныя кабінеты, лабараторыі біялогіі, фізікі і астраноміі, актавая зала амаль на 300 месцаў. Ёсць месца і для заняткаў спортам: гульнявая зала, трэнажоры, басейн. Размешчана школа ў новым мікраёне жылой забудовы горада. Два гады таму тут увялі ў строй сучасны дзіцячы садок на 330 месцаў.

Сучасна выглядаюць спартыўныя залы і інфармацыйна-тэхнічны цэнтр — бібліятэка. Сталовая больш нагадвае ўтульнае кафэ, разлічанае на 324 пасадачныя месцы. Кухары абяцаюць, што ежа таксама будзе смачнай і разнастайнай.

Па-новаму выглядае і Цэнтр бяспекі МНС. З дапамогай трэнажораў-стымулятараў школьнікі могуць адпрацаваць


Фота БелТА.

навыкі ратавання людзей, карыстання сродкамі пажаратушэння, эвакуіравання з задымленага памяшкання і гэтак далей.

А яшчэ дзеці змогуць у вольны час займацца харэаграфіяй.

Старшыня Мінаблвыканкама даў наказ моладзі: «Шануйце той час, які вы праводзіце ў школе. Мяркую па сабе. Мне гэтак жа казалі бацькі. І гэта не заўсёды было зразумела. Але праз гады прыходзіць усведамленне, што гэта быў найлепшы перыяд». Пасля ўрачыстай часткі мерапрыемства Аляксандр Турчын уручыў установе адукацыі сертыфікат на 20 тысяч рублёў.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

---

Напярэдадні

# Як і дзе адзначым дзень нараджэння сталіцы?

## Рыцарскія турніры, квэсты, кірмашы і феерверкі

**Штогод у другую суботу верасня ў Мінску адзначаецца важнае і любімае свята — Дзень горада. Сёлета беларускай сталіцы споўніцца 957 гадоў. Асноўныя мерапрыемствы адбудуцца ў суботу 14 верасня, але святкаваць пачнём крыху раней. Прагама, як і заўсёды, абяцае быць даволі насычанай. Пра тое, якія лакацыі падрыхтавалі для жыхароў і гасцей сталіцы, абмеркавалі на пасяджэнні ў Мінскім гарвыканкаме. Карэспандэнт «Звязды» сабраў важныя звесткі пра тое, куды можна схадзіць і на што цікава паглядзець.**

### «МІНСКІ МАЙСТАР» І ДНІ ЕКАЦЯРЫНБУРГА

«Жыхароў і гасцей сталіцы чакае больш за 100 насычаных мерапрыемстваў. У Мінскай гарадской ратушы 10 верасня адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання мінчан, якія актыўна ўдзельнічаюць у ахове грамадскага правапарадку і прафілактыцы правапарушэнняў. Найлепшыя з найлепшых будуць узнагароджаны заахвочваннямі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, пракуратуры горада Мінска і ГУУС Мінгарвыканкама, — распавяла **начальнік упраўлення культуры Мінгарвыканкама Кацярына ЛУЧЫНА.** — У канцэртнай зале «Верхні горад» 13 верасня будуць падведзены вынікі гарадскога конкурсу «Мінскі майстар».

«Конкурс «Мінскі майстар — 2024» прайшоў сярод прадстаўнікоў 39 найбольш масавых прафесій: кіроўца (аўтамабіля, тралейбуса, трамвая, пагрузчыка), прадавец, токар, урач, настаўнік, ратавальнік-пажарны, сацыяльны работнік, швачка, прыбіральшчык тэрыторый, рабочы зялёнага будаўніцтва, цырульнік, паштальён і інш.). У конкурсах па дадзеных прафесіях узялі ўдзел больш за 1,5 тысячы работнікаў. Сярод пераможцаў — 11 чалавек ва ўзросце да 31 года», — адзначыла начальнік упраўлення культуры.

Таксама ў Мінску ў гэты дзень пройдуць дні горада Екацярынбурга. Яны будуць уключаць выставу расійскага мастака Аляксея Ягфрэмава ў галерэі Міхаіла Савіцкага, а таксама выставу пра гісторыю горада ў адным з філіялаў Музея гісторыі Мінска. Акрамя таго, чакаецца канцэртная праграма з удзелам калектываў з Екацярынбурга на плошчы Свабоды. У адной з бібліятэк Мінска будзе створаны тэматычны куток Екацярынбурга.

У гасцініцы «Вікторыя Алімп Атэль» 13 верасня будзе праходзіць Міжнародны форум эканамічнага супрацоўніцтва. У рамках форуму адбудзецца пленарнае пасяджэнне, будуць працаваць дзве секцыі. У форуме возьмуць удзел каля 200 чалавек.

### ГОРАД СТАРАЖЫТНЫ, ГУБЕРНСКІ, РЫЦАРСКІ

Па словах начальніка ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама, галоўныя святочныя ўрачыстасці ў сталіцы пройдуць 14 верасня: «Адкрые святочныя мерапрыемствы ўрачыстая цырымонія ўскладання кветак да абеліска «Мінск — горад герой». Канцэпцыя цырымоніі ўскладання будзе заснавана на раскрыцці тэмы «Гістарычная памяць у традыцыях пераемнасці пакаленняў». Ва ўскладанні кветак возьме ўдзел кіраўніцтва горада, члены замежных дэлегацый, структурныя падраздзяленні Мінгарвыканкама, кіраўнікі і супрацоўнікі праваахоўных органаў, адміністрацыі раёнаў, кіраўнікі і актыў мінскіх гарадскіх арганізацыйных структур грамадскіх аб'яднанняў.

У цэнтральнай частцы горада на зялёнай зоне скрыжавання праспекта Пераможцаў — праспекта Машэрава ў 10.30 адкрыецца фестываль гістарычнай рэканструкцыі «Мінск старажытны». «Гэта тэатралізаванае, відовішчнае, інтэрактыўнае дзеянне з удзелам клубаў гістарычнай рэканструкцыі. Праграма фестываля будзе насычана мерапрыемствамі, якія найбольш поўна перададуць атмасферу рыцарскага турніру, перацягваючы з аднаго захапляльнага спаборніцтва ў іншае. Зможам прасякнуцца духам гісторыі пачынаючы з XIII стагоддзя і заканчваючы перыядам Вялікай Айчыннай вайны», — адзначыла Кацярына Лучына.

На тэрыторыі Траецкага прадмесця і Верхняга горада разгорнецца «Мінск губернскі». Жыхароў і гасцей горада будуць сустракаць касцюміраваныя персанажы XVIII—XIX стагоддзяў. Ахвотныя змогуць пакатацца на карэтах, паўдзельнічаць у інтэрактыўных мерапрыемствах і паслухаць жывую музыку адпаведных гістарычных перыядаў. А на пляцоўцы каля Ратушы з 12.00 да 15.00 запланавана канцэртная праграма «Хіты Прэзідэнцкага аркестра».


Фота БелТА.

### АЛІМПІЙЦЫ І РАТАВАЛЬНІКІ

Сумесна з Нацыянальным алімпійскім камітэтам на пляцоўцы каля Палаца спорту 14 верасня будзе арганізаваны Алімпійскі дзень. «Урачыстая цырымонія яго адкрыцця адбудзецца ў 12.00. У спартыўным свяце чакаецца ўдзел беларускіх спартсменаў, пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх турніраў. Прадугледжана размяшчэнне больш як 30 спартыўных і забаўляльных пляцовак. Удзельнікі алімпійскага дня змогуць выпрабаваць свае сілы ў баскетболе, боксе, барацьбе, веласпорце, валейболе і іншых відах спорту», — распавяла Кацярына Лучына.

Спартыўныя конкурсы для дзяцей ад 3 да 14 гадоў пройдуць у фармаце алімпійскага квэсту. «У рамках мерапрыемства плануецца арганізаваць канцэртную праграму з удзелам маладзёжных творчых калектываў і артыстаў беларускай эстрады. Таксама прапрацоўваецца пытанне ўдзелу ў канцэртнай праграме хэдлайнера», — адзначыла начальнік упраўлення культуры.

Таксама на пляцоўцы каля Палаца спорту з 8.00 да 18.00 пройдуць міжнародныя спаборніцтвы «Наймацнейшы пажарны-ратавальнік». «Удзел возьмуць пажарныя-ратавальнікі абласных (Мінскага гарадскога) упраўленняў па надзвычайных сітуацыях, Універсітэта грамадзянскай абароны МНС, рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «ЗУБР». Акрамя таго, запрашэнні аб удзеле ў спартыўным першынстве накіраваны прадстаўнікам МНС Расіі, Казахстана, Узбекістана, а таксама Міністэрства грамадскай бяспекі Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам», — дадала Кацярына Лучына.

### СЕЛЬГАСКІРМАШЫ І ФЕЕРВЕРКІ

Сёлета ўлады Мінска вырашылі не парушаць традыцыю і даць старт кірмашам па продажы сельскагаспадарчай прадукцыі ў сярэдзіне верасня. Асноўнай лакацыяй для правядзення сельскагаспадарчых кірмашоў у 2024 годзе застанецца пляцоўка каля «Чыжоўка-Арэны». Гэтае месца даўно палюбілася гараджанам. Сюды зручна пад'язджаць, тут даволі прасторна для размяшчэння вялікай колькасці ўдзельнікаў. З улікам таго, што ўлады горада прывыклі ярка і маштабна адкрываць сельскагаспадарчыя кірмашы, і ў сувязі з тым, што Дзень горада сёлета таксама выпадае на 14 верасня, было прынята рашэнне падоўжыць мінчанам свята.

Па традыцыі на працягу амаль усёй восені ў Мінску будуць працаваць штодзённыя пляцоўкі па рэалізацыі сельскагаспадарчай прадукцыі фізічнымі асобамі, сялянскімі і фермерскімі гаспадаркамі. Гэтыя лакацыі будуць функцыянаваць два месяцы: з 16 верасня да 17 лістапада.

Кірмашы, якія будуць праходзіць ва ўсіх адміністрацыйных раёнах Мінска, не адкрыюцца адначасова. Напрыклад, сезон на пляцоўцы каля Палаца спорту — яшчэ адным папулярным у жыхароў сталіцы месцы закупак прадукцыі беларускіх аграрыяў — стартуе 21 верасня. Працягнецца сезон сельскагаспадарчых культур у 2024 годзе да сярэдзіны лістапада. Але свае карэктывы можа ўнесці надвор'е: калі тэмпература стане стабільна мінусавай раней, то кірмашы спыняцца.

Пералік абяцае быць вельмі разнастайным. Часцей за ўсё на кірмашах прапануюць таксама лекавыя травы, грыбы, арэхі, дзікаросы, прадукцыю пчалярства і жывёлагадоўлі. Арганізатары нагадваюць: усё гэта фізасобы могуць рэалізоўваць без выплаты адзінага падатку. Праўда, ёсць некалькі нюансаў. Напрыклад, забараняецца продаж малочных прадуктаў, якія не прайшлі ветэрынарна-санітарную экспертызу. А вось пры рэалізацыі мёду і прадукцыі пчалярства патрабуецца даведка, што ўсё гэта выраблена ў Беларусі.

У вячэрні час з 19.00 да 21.00 на плошчы Свабоды адбудзецца ўрачыстая цырымонія ўручэння ўзнагарод «Мінчанін года» ў суправаджэнні заслужанага калектыву Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь. Таксама 14 верасня плануецца арганізаваць сямейнае свята ў Цэнтральным дзіцячым парку імя М. Горкага. Там пройдуць дзіцячае свята і выстава рэтрааўтамабіляў. Музычна-піратэхнічнае феерверк-шоу можна будзе ўбачыць на пляцоўцы каля Палаца спорту ў 23.00.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**